## АЗОЛІНА НІНА АДОЛЬФАЎНА



**Дата нараджэння:** 21.01.1926

**Дата смерці:** 05.10.1943

**Месца нараджэння:** в. Зуі, Шумілінскі раён, Віцебская вобласць

**Месца подзвігу:** чыгуначная станцыя Обаль

**Дата подзвігу:** 1942–1943

**Ушанаванне**: г. п. Обаль, Шумілінскі раён – вуліца

У 1942 годзе стала членам падпольнай арганізацыі «Юныя мсціўцы». Па заданні Сіроцінскага падпольнага райкама КП(б) Беларусі працавала перапісчыцай у камендатуры. Добра наладжаная сувязь з партызанамі спрыяла перадачы тэрміновых звестак у кароткі час. Месцам абмену інфармацыяй стаў «маяк» – тапаграфічная вышка, што месцілася прыкладна на паўшляху да вёскі Ушалы.

Вялікую страту Обальскаму чыгуначнаму вузлу нанесла дыверсія на вадапомпавай станцыі, якую правяла Ніна Азоліна. У партызанскім атрадзе вырабілі невялікую, але моцную міну ў выглядзе кавалка антрацыту, якую прынесла Е. Зянькова. Ніна прайшла на тэрыторыю вадакачкі быццам бы дзеля таго, каб падлічыць запасы вугалю, і падкінула туды свой «антрацыт». 19 жніўня 1943 г. міна трапіла ў топку, і кацёл узарваўся. Рух цягнікоў быў спынены на восем дзён, а савецкая авіяцыя атрымала аб'екты для прыцэльнага бамбардзіравання. У архіве захавалася данясенне аб выбуху: «Вызначыўся: нягласнік пад псеўданімам Гаўрылаў». Гэта быў псеўданім Н. Азолінай.

28 жніўня пасёлак Обаль, вёскі Зуі, Масцішча, і Ушалы адначасова акружылі фашысты. Былі арыштаваны многія ўдзельнікі падпольнай арганізацыі, сярод якіх была і Ніна Азоліна.

Спробы гітлераўцаў зламіць баявы дух арыштаваных зверскімі катаваннямі не далі вынікаў. Знявечаная Ніна на адным з допытаў, узняўшы левую руку, адважна кінула ў твар палачам: «Так, не адмаўляюся! Гэтай рукой я ўзарвала вадакачку!». І, паказваючы на мёртвую, пакалечаную правую руку, дадала: «А гэтай збіралася ўзарваць камендатуру! Больш я нічога не скажу!». Такую ж стойкасць і вытрымку праявілі ўсе патрыёты. 5 кастрычніка 1943 года пасля саракадзённых катаванняў яны былі расстраляны каля вёскі Баравуха Полацкага раёна.

Н. А. Азоліна пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Яе імя носіць вуліца ў г. п. Обаль Шумілінскага раёна. У гарадскім пасёлку створаны музей Обальскага камсамольскага падполля і пастаўлены помнік.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Азолина** Нина Адольфовна // Их именами названы : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 23.

2. **Азолина** Нина Адольфовна // Память : историко-документальная хроника Шумилинского района / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.] ; худож. А. Н. Хилькевич. – Минск, 1985. – С. 161.

3. Захаранка, А. У бой вялі непрымірымыя … / А. Захаранка // Маладосць. – 2004. – № 5. – С. 124–130.

4. **Ляшчынскі, Д. С.** Героі Обальскага падполля / Д. С. Ляшчынскі // Народная асвета. – 1983. – № 7. – С. 10–14.

5. **Мезенка, Г. М.** Азолінай вуліца / Г. М. Мезенка // Віцебшчына ў назвах вуліц : манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск, 2008. – Ч. 2. – С. 6.

**Азолина** Нина Адольфовна // Их именами названы : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 23.

**АЗОЛИНА НИНА АДОЛЬФОВНА** (21.1.1926—5.10.1943)

*Один из организаторов и руководителей Обольского комсомольского подполья, участница партизанского движения на территории Витебской обл. в годы Великой Отечественной войны.*

Родилась в д. Зуи Шумилинского р-на Витебской обл. Член ВЛКСМ. Окончила 8 классов Обольской средней школы. В мае 1942 вошла в руководящее ядро подпольной комсомольской организации «Юные мстители» в г. п. Оболь, созданной по инициативе Сиротинского подпольного райкома КП(б)Б и действовавшей в тесном контакте с командованием партизанского отряда им. К. Е. Ворошилова бригады им. В. И. Ленина Витебской обл. По заданию подпольной организации Н. А. Азолина устроилась на работу переписчицей в немецкую комендатуру в г. п. Оболь. Имея доступ к некоторым секретным документам, получила возможность передавать партизанам важные сведения о подготовке гитлеровцами карательных операций, заверенные печатями немецкие свидетельства-паспорта, оружие и медикаменты. В августе 1943, когда гитлеровское командование увеличило переброску живой силы и техники по Рига-Орловской железной дороге, на перегоне Полоцк-Витебск Н. Азолиной было поручено взорвать водокачку на ж.-д. ст. Оболь, единственную из действовавших тогда в этом районе. В результате взрыва на неделю было прервано движение вражеских поездов по линии Полоцк – Витебск, а советская авиация по сигналам разведчиков успешно бомбила скопления вражеских эшелонов. 28.8.1943 арестована вместе со многими подпольщиками. После пыток в г. п. Шумилино и в полоцкой тюрьме расстреляна гитлеровцами в д. Боровуха 1-я под Полоцком. Посмертно награждена Орденом Красного Знамени.

Именем Н. А. Азолиной названа улица в г. п. Оболь; создан музей комсомольской славы и установлен памятник членам подпольной организации «Юные мстители» в г. п. Оболь.